Падтрымай "Вясну" на PATREON

За абразу пракурора Таратынка мужчыну пакаралі двума гадамі "хатняй хіміі"

29.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Суд Савецкага і Першамайскага раёнаў Мінска. Фота spring96.org

У судзе Першамайскага раёна г. Мінска разглядзелі справу ў дачыненні да Дзмітрыя Невяроўскага, якога вінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК).

Справу разглядаў суддзя **Максім Трусевіч**, бок дзяржабвінавачвання падтрымліваў **Мацвей Худаешка**.

Паводле абвінавачвання, Дзмітрый Невяроўскі пакінуў абразлівы нецэнзурны каментар у тэлеграм-чаце “Карателі Беларуси” пад фота старэйшай памочніцы пракурора Фрунзенскага раёна **Валерыі Таратынка** ў сувязі з выкананнем ёй сваіх службовых абавязкаў, чым прынізіў яе гонар і годнасць.

Дадзены каментар быў дасяжны для неабмежаванага кола карыстальнікаў інтэрнэт.

Абвінавачаны знаходзіўся на падпісцы аб нявыездзе і належных паводзінах, мае 3 групу інваліднасці. У судзе абараняў сябе сам. Ён поўнасцю прызнаў віну, сказаў, што пакінуў каментар на эмоцыях пасля таго, як прачытаў шмат розных навінаў, не хацеў прычыніць маральныя пакуты пацярпелай.

Пацярпелая **Валерыя Таратынка** ў судзе распавяла, што працуе ў пракуратуры з 2017 года, удзельнічала ў якасці дзяржаўнага абвінаваўцы ў крымінальных працэсах і ажыццяўлала нагляд па адпаведных крымінальных справах.

7 снежня 2020 года ў адным з дэструктыўных тэлеграм-каналаў былі размешчаныя фота і персанальныя дадзеныя, у тым ліку сведчанні пра асабістае жыццё: імя і прозвішча, дата народзінаў, месца пражывання, мабільны тэлефон, паспартныя дадзеныя. Там жа было ўказанае і службовае становішча. Пазней – 15 студзеня 2021 года – ўказаны запіс быў прадубляваны ў тэлеграм-канале “Каратели Беларуси”, якая мела магчымасць каментавання. У гэты ж дзень і наступныя дні пад запісам былі размешчаныя абразлівыя каментары, у тым ліку і абвінавачаным.

> *“Лічу, што каментар, размешчаны абвінавачаным, быў пакінуты ім ў сувязі са службовым становішчам, што я займала як прадстаўніка ўлады, паколькі раней з абвінавачым я знаёмая не была, ніякіх непрыязных адносінаў адзін да аднага мы не адчувалі”,* - падкрэсліла Таратынка.

Да моманту суда Дзмітрый Невяроўскі з Валерыяй Таратынка не сустракаўся, не прыносіў ёй прабачэнняў, не прадпрымаў ніякіх мераў па кампенсацыі шкоды. Аднак пасля таго, як пацярпелая пачула, што абвінавачаны мае групу інваліднасці, і толькі на гэтай падставе – яна вырашыла не заяўляць грамадзянскі іск па кампенсацыі маральнай шкоды.

Абвінавачаны выбачыўся перад пацярпелай, патлумачыў, што ў той вечар прачытаў шмат навінаў, быў усхваляваны і ў тэлеграм-канале пабачыў фота і апісанне пра пракурора, пакінуў каментар. У судзе казаў, што яго дзеянне не было справядлівым, звычайна ён нікога не абражае.

> *“Гэта было зроблена мной па глупству, у той момант я не ведаў, да чаго гэта можа прывесці”.*

Таратынка прыняла прабачанні, выказала спадзяванне, што Невяроўскі зробіць адпаведныя высновы і больш не парушыць закон. Пасля гэтага яна пакінула залю суда.

У судзе былі вывучаныя пісьмовыя матэрыялы справы. У іх сярод іншага адзначалася, што ў абвінавачанага быў праведзены вобшук, падчас якога былі канфіскаваныя і далучаныя ў якасці рэчавых доказаў палотнішча, бела-чырвона-белы сцяг, два балоны з чырвонай фарбай, керамічны выраб з выявай герба “Пагоня”, вокладка з выявай “Пагоня”.

Падчас спрэчак бакоў пракурор прасіў суд прызнаць Дзмітрыя Невяроўскага вінаватым у абразе прадстаўніка ўлады і **пакараць яго двума гады абмежавання волі без накіравання** ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Раніцай 29 ліпеня суд агучыў прысуд. Максім Трусевіч палічыў віну Дзмітрыя Невяроўскага даказанай і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе двух гадоў “хатняй хіміі”.

Суд таксама пастанавіў: мабільны тэлефон канфіскаваць як сродак здзяйснення злачынства, а вынятыя рэчавыя доказы - знішчыць.

Твитнуть









ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне





ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ





ПАРТНЁРСТВА

Рацыя

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY